I. 255.876 cim.

ADAM CHMIEL

# BIAŁORUSKA PIEŚŃ GMINNA

ODBITKA Z TOMU VII CZĘŚCI I
MATERYAŁÓW I PRAC KOMISYI JĘZYKOWEJ
AKADEMII UMIEJĘTNOŚCI W KRAKOWIE

W KRAKOWIE
Nakładem Akademii Umiejętności
Skład główny w księgarni spółki wydawniczej Polskiej
1928

ADAM CHMIEL

# BIAŁORUSKA PIEŚŃ GMINNA

ODBITKA Z TOMU VII CZĘŚCI I
MATERYAŁÓW I PRAC KOMISYI JĘZYKOWEJ
AKADEMII UMIEJĘTNOŚCI W KRAKOWIE

W KRAKOWIE
Nakładem Akademii Umiejętności
Skład główny w księgarni spółki wydawniczej Polskiej
1928

Drukarnia Uniwersytetu Jagielońskiego pod
zarządem J. Filipowskiego.

PIEŚNI ZEBRANE W ZIEMI WILEŃSKIEJ.

BIBLIOTEKA NARODOWA

I 255.876

Cimelium

1969 D. 1224/29

Л. РОДЗЕВІЧ.

# НА ПАНЯВОЛЕНЫХ ГОНЯХ.

ВЕРШЫ.

БАРАЦЬБІТОМ ЗА ВЫЗВАЛЕНЬНЕ
ЗАХ. БЕЛАРУСІ З ПАД ПАНСКАИ
АКУПАЦЫІ ПРЫСЬВЯЧАЮ.

А Ў Т А Р.

* * *

Цяпер іх сіла,—наша кроў
Чырвоніць мур, цьвіце на гонях.
Яны нам сэрца рвуць з грудзёў.
Прыкладам б'юць—друзгочаць скроні.
На трэсках вырубленых пушч
Сьляды растрэленых паўстанцаў.
Пакору ад працоўных гушч
З жыцьцём вымушваюць пазнанцы.

Хутчэй ударыць бы па іх
З усім размахам нашай сілы!
Хутчэй даждаць часоў нам тых,
Калі-б удар наш—ім магіла.
Зацялі губы да крыві,
Нутро сасьмягла дамаганьнем:
„Бі акупанта, з корнем рві!"
Зьдзек страшны іх, ды горш чаканьне.

Што-ж, акупант, бушуй пакуль,—
А мы мецъ будзем перамогу.
На вас усіх нам хопіць куль.
На помсту нашу—вас нямнога.

## У ВАСТРОЗЕ

Гляджу праз вакно з густой кратай—
Там сьнегу багата, багата;
Там шэрае неба застыла
І сьнег мяце, сыпець, штурмуе...

Як сэрца за шчасьцем сумуе.
Як воля мне дорага, міла,—
Хоць там за вакном з густой кратай
Так сьнегу багата, багата...

## ПАЛІТВЯЗЕНЬ

У мурох тых, як у граніцы
З панскай волі трутнем стаўся.
Гібне ў вільгаці, у цемры
Хоць ня збойца, не пракраўся.

За вакном варона крача,
Што ня можна быць іначай.
За акутымі дзьвярамі
Цэрбэр бразгае ключамі.

Есь ён полиўкі з гароху
І глытае сум за воляй.
А яго ядуць плюгаўствы,
Зьздек, ражым, іх самаволя.

За вакном варона...

Ўскочыў на зуб дэфэнзыве,
Бо схацеў так шпік дасужы.
Ў самаго-ж не пападае
Зуб на зуб ад страшнай сьцюжы.

За вакном варона...

Думкай лётае па вёсках
І па фабрыках шумлівых.
Сам штодня мяшок каменны
Мерыць крокам нецярпліва.

За вакном варона...

Катаваньнем не зламалі
Пролетарскі дух рашучы,
Прасьлязіўся як у цэлю
Матылёк праз краты лучыў.
За вакном варона...

Кожны дзень жджэ, што Кастрычнік
Раздрузгоча ўсе запоры.
Кожны момант дакучае:
— Шэсьць гадоў сядзі ў пакоры.
За вакном варона крача
Што ня можа быць іначай.
За акутымі дзьвярамі
Цэрбэр бразгае ключамі.

## НЯВОЛЯ, ЗМАГАНЬНЕ, ПЕРАМОГА

I.

Ноч падзяліла... Сьветач дзе? Жыва!
Шоўгаем... слізка... Балота ці кроў?
Сыкаюць цені... Абоймы... Тужліва
Дбайце аб волі. Волі!
Хрыпат братоў...
Душаць...
Людзі ці зьвери?—
Сэрца гвалтоўна б'ецца ў дзьверы,
Зялезныя дзьверы жыцьця,—
Волі! Волі!
Сьвету-б праменьчык хаця!
Так ня было і ня будзе ніколі.
Лацунг-спавіяч з адчаю зубамі
Грызуць .., скрогат, стагнаньне...
Пры катаваньні для мук тамаваньне
Робяць сьвятымі славамі:
„Жыві Беларусь—сьвятліца працоўных!"
Ах, колькі-ж ёсьць мук нявымоўных!

II.

Агнём сваёй помсты
Мы цемру запалім,
Тугу, безнадзейнасьць
Разьвеем, расплавім.
Агонь у нявольных
Руках судзьдзя строгі:
У попял заменіць
Кайданы вастрогі.
Агонь, не давалі
Багі—ліхадзеі.
Цяпер хай лагво іх
У попел сатлее.
Агонь сонца-бацька,
З агню маць-зямелька,
Агонь—вось сусьвету,
Ён сьмерць-збавіцелька.
Хай Жыжа укусіць
За карак злой ночы.
А полымя сушыць
Заплаканы вочы.
Агонь ганец гонкі,
Раскрыўшы заслоны,
Пакажа як скача
Ён жвавы, чырвоны.

Ен музыка помсты,
Пяецъ і бушуе.
Пылай жа агнісьцей,
Хто скуты начуе!

III.

Настане час, як рэха творчай, спорнай працы
Акордамі атуліць землю-мацьь.
Ї задрыжыць зямля ў захопленьні юначым.
Аркестр касмічны годзі хвальшаваць.

Настане час—аб гэтым кажа мудрасьць краскі,
Пчала мядком пахучым вабіць нас.
Туды нас кліча сонца, сьпелай нівы ласкі,
Барацьбіты за волю, гэны час.

## У СЬВЯТОЙ У РЭЧЫПАСПАЛІТАЙ

У сьвятой у Рэчыпаспалітай
Салам абрасьлі ксяндзы святыя.
Стада іх сьвятым-жа духам сыты,
За грахі і бедны, і худыя.
　　Ў шляхоцкай Рэчыпаспалітай
　　Роскашы, распусты пану мала.
　　Вось таму працоўныя набіты
　　І цюрмой народаў Польшча стала.
У грабежна-фашыстоўскім краі
Урад з паноў, ксяндзоў і ўгоды,
Душыць нас, бы ліпку абдзірае
Усё для бога, краю і „свабоды“.
　　Польшча край, дзе кроў цячэ вякамі,
　　Кроў з пад пят паноў і акупантаў.
　　Польшча на шляху Саветаў камень,
　　Кінуты пужліваю Антантай.
Ўжо бітком набітыя вастрогі
І даўно падпольле стала цесным.
Ўжо рабочы, селянін убогі
Вуліцай на бой ідуць сумесна.
　　Тэй мільённай мускулістай сіле
　　Толькі ўперад мкнуцца безустанна—
　　Аж зьядуць паны, што наварылі
　　І пажнуць, што сеелі старанна.

# ТУТ І ТАМ

Ой шмат на сьвеце бед сплыло,
Сабраць іх разам горай мусіць
Ніколі так бы ня было,
Як у Заходняй Беларусі.
Гэрб панскі, белы іх арол
У лапы зрэпіў знак праўленьня:
Нагайку, путы—то для сёл
І для рабочых на глумленьне.

Там молат вольнай працы знак,
А серп пажне таму, хто сее.
Мазоль грамадзкасьці адзнак.
Жыцьцё цьвіце і багацее.
Тут пан загнаў наш творчы дух
На глум вільготнага падпольля
І скарыстаў наш кожны рух,
Каб збольшыць роскаш, самаволю.

А там рабочы, селянін,
Будуюць гмах культуры новай.
А праца ўсіх людзей, машын
Ёсьць для рэспублікі аснова.
Тут Беларусь жывець, каб мсьціць
Крывавай панскае навале.
Тут толькі руйнаваць і біць
Пакуль нас трупам не паклалі.

Там Беларусь—красуня ўсім
Сама парадак свой наводзе.
Савецкі лад у краі тым,
Там адражэньне наша ўсходзе.
Браты, цярпець даволі нам,
Хто жыў да бою, да змаганьня
За лад які існуе там,
За Беларусі аб'яднаньне.

BIBLIOTEKA NARODOWA

## У ДЭФЭНЗЫВЕ

Палачы, акупанты, фашысты,
Здраду хочаце вырваць з жыцьцём.
Мае раны пад вашым біцьцём
Загамоняць больш цьвёрда, вагніста,
Што ня выдам братоў палачом.

Выдумляць горшы зьдзек, катаваньне
Не патрэбны турботы для вас.
Што мне боль, калі ў гэты я час
Палыхаю жаданьнем паўстаньня
Шматмільённых прыгнечаных мас!

Хоць вы сэрца на часткі парвіце,
У кожнай частцы жыць буду, каб мсьціць,
Помсты нашай нічым не згасіць.
Блізкі час, калі мы бліскавіцай
Тут запалім часы навальніц.

## ЧЫМ ЖЫВЕ РАБОЧЫ.

Я пры станку штодня пацею,
А дома голад сьмерцяй страша,—
Жыву змаганьнем і надзеей,
Што перамога будзе наша.

Як волі сьцяг непераможным
У час разгону дэманстрацый,
Так я хачу на кроку кожным
Рэвалюцыйну моц трымаці.

Тут вычвараюць зьдзек для зьдзеку.
Зьдзіраюць скуру—крыкнуць годзе.
Тут дэфэнзыўная апека.
Ражым фашысцкі верхаводзе.

Вось адрываюць ад машыны
На беспрацоўнае глумленьне,
Бо для мяне ўвесь сьвет айчына,
А зьбеларушчыў кут раджэньня.

За забастоўку ў абороне
Патрэб і наша існаваньне
Дадуць па панскаму закону
Гады вастрогу, катаваньне.

За старасьць, хворасьць ці калецтва
Вон гоняць з фабрыкі ды квіта,
Хоць працаваў там з маледзтва,
Хоць потам нашым скарб іх зьліты.

Ды не зняволіць ім рабочых,
Бо ў барацьбе мы моц гартуем.
СССР-жа відавочна
Сьведча, што зможам іх, зваюем!

## ВЫ І МЫ

Вашы сэрцы бы апенькі
На карчы жыцьця грыбеюць.
У збуцьвелых душах зрэнкі
Цьвільлю лужы зелянеюць.
Вы начных прывідаў цені.
Вам скон дня збаўленьнем сьніцца.
Плюйце-ж, кідайце каменьні
На Ўсход,—там дзень крыліцца.
Што-ж цьвякі падносьце катам,
Укрыжуйце катаваных.
... Аж падойдзе к бедным хатам
Чырвань-сказ вясной прыбраны.
Выйдзем з хат мы як у сьвята
Як выходзім першым маем,
Станем поплеч брат і з братам,
Рушым, зможам, заўладаем.
Крышка вам—канец бядзе!
Па краіне галасістай
Радасьць узрасьце квяціста,
Радасьць Нам, Агню, Вадзе.
Нас ёсьць тройца. Мы зьмест слова
Вечны рух, жыцьця аснова,
Згучнасьць, вечнасьці закон,
Песьня працы, сталі звон.

## ГУТАРКА МУЖЫКА З ПАНАМ

— Быдла, хам ты, совбандыта,
Мала знаць цябе набіта.
Ведай, што Рэчпаспаліта
Не тваё, сьвіньня карыта.
Я тут пан, цалуй мне боты,
Бо бізун дадасьць ахвоты.
Як ня выплаціш падаткі,
Забяру твае манаткі
Сам да „татавае хаткі“
Пойдзеш, год, за беспарадкі.

— Ціха, ціха, егамосьцю,
Бо магу ня зьдзержыць злосьці.
Вы ня прошаныя госьці
Сталі як у горле косьці.
Знай, сагнуць мяне ня ўдасца—
Страсане цябе перш трасца.
Кроў маю, кроў рабочая
Ты па краю разьліваеш,
А з крыві тэй узрастае
Чырвань-краска веснавая.
Беражыся-ж нашай сілы—
З сала пана будзе мыла!

— Слухай, браце, брыдка гэтак—
Прытрухнуў пан напасьледак,—

Каб ня вадзіцца нам болей,
Як дажджом святых „ніколі“,
Дык табе дам крыху волі,
Дам на хлеб шчыпочак солі.
Ты за гэта будзь пакорны,
Бо твая, брат, костка чорна.
— А, панок мой міласьцівы,—
Селянін сказаў ласьліва.
Мне даваў і я дам раду:
Выбірайся без агляду
На сухія вербы, лозы,
Дзе Макар ганяе козы,
Я тут сам, бяз пана, неба,
Буду хлеб мець і да хлеба.
Узрасьце ўсё, што мне трэба
Вольная мужыча глеба.
Дык, панок мой міласьцівы,
Вон ад гэтуль крута, жыва!

## ПРАБУДЖЭНЬНЕ.

Вецер у сьцяну ночы злой задрагаў.
Вецер зьдзмухануў пыл начны са сьцягаў.
Певень запяяў. Дзень сабраў ўсе росы.
Гук загаманіў гудам шматгалосым.

Выклікала з пушч сонца залатое
На абшары ніў вечна маладое,
Чырваньню яно зацьвіло яскрава—
Хто праснуўся, тым барацьба і слава.

# КЛІЧ.

Паўстаньце мільёны, пабеда за намі!
На бой да чырвонае мэты:
За волю, зямлю, за саветы!
Няшчадна біць пана аружжам, славамі!
Зруйнуем—збудуем сваімі рукамі!

## ДА МАЛАДЫХ.

Беларус малады, што гальчэеш бядак.
Паўстань, выйдзі з хваль ніў залацістых;
Зварухні, скліч, зьяднай як ты гэткіх ваяк,
Чые рукі ў значкох мазалістых.

І нясеце моц пушч, разгул бур веснавых,
Праўд і песянь нягаданых, новых.
Узгарыце мяжу між сваіх і чужых,—
Знаймо вольных, працоўных, здаровых.

Юнакі-сілачы вызваляйце зямлю
Ад паганых рук старага сьвету—
Ўжо спрухнеў гэты сьвет,—хай-жа тлусьціць ральлю;
Быць хоць раз ураджайнаму лету.

Многа ёсьць злыбяды, ліхадзеіць туга,
Дармаед сваяволіць бяскарна,
Пухнець з роскашы пан, грабіць ён як мага...
Эх, няўжо-ж гінуць нам гэтак марна?

Не! Яшчэ сонца ёсьць, руніць поле вясной,
Льдом адвечным вада не скавана,
Ёсьць імпэтны ўзлёт дум грамады маладой.
Што у працы цяжкой гартавана.

Дык дарогу шырэй недалюдкі, брыда,
Дык дрыжы, хто людзкую кроў смокча,
З песьняй помсты ідзе маладых грамада,
Ваша логава мігам здрузгочаць.

Іх прызвала жыцьцё, іх, працоўных сыноў,
Надзяліла змаганьне натхненьнем.
З фабрык, вёсак ідуць з усялякіх краёў,
Процiў вызыску і прыгнячэньня.

## АТАМАН МУХА.

Польскі бот неміласэрна
Топча край беларусоў.
Грабіць, муча пан бязьмерна—
Ня было такіх часоў.
Стогнуць вёскі ад падаткаў,
Пухне з голаду народ,
Лад вядзе бізун і ўзятка,
Патурае розны зброд.
Вось на помсту за няволю,
За грабежствы і за зьдзек—
Стаў на кліч народнай волі
Беднай вёскі чалавек.
З партызанамі-арламі
Гэта Муха бальшавік
Пострахам быў над панамі
Каб вальней мог жыць мужык.
Горы золата з палацаў,
Муха скажа, дык плыве,
Скуль узята, там дзе праца
Ў курнай хатачцы жыве.
Дзьмухане са злосьці Муха—
Мігам зьнікне панскі двор.
Кулаком з размаху бухне—
Ляжа варагаў бугор.

Мухі моц не пераможна
Бо пакрыўджаныя з ім.
Нават Польшча вельміможна
Ператрусіла зусім.

Лес і поле, горы, долы
Атамана берагуць.
Беларусі вёскі, сёлы
Пад яго крыло ільнуць.

Скалыхнуўся люд да бою,
Правадырыць атаман,
Прападай-жа з галавою,
Акупант наш, польскі пан!

## МАРШ РАТУЕЎ.

Гэй, ратаі, мы маем моц кайданы рваць,—
Стаў неўмагату панскі вызыск, зьдзек.
Дык бунтары вясковых гонь, працоўна рацьь
З боем, сілай брацьь граблёнае век.

Шум грамады, бразг кос, сярпоў узнозяць сьцяг—
Хоча наш аблог коласам зьвінець.
Дасьпей удар, красуй паход, расьці размах.
Краска цаліны гіне ў баразьне.

Чырвоны рух па гарадох як гром, віхор.
Жах трасе палац, помста вышла з хат.
На збор гудкі гудуць у даль нізін і гор.
Песьня, кліч, праклён. Бунт дае загад.

Гэй, ратаі, сермяжны люд усей зямлі,
Больш мы не рабы, час ярмо скідаць.
На барацьбу, мы змагары ад ніў, ральлі,
Па савецкі лад, па зямельку мацьь!

## ПЕСЬНЯ ПАЎСТАНЦА.

Б'ем мы пана чым папала,
Абы гаду тут ня жыць.
Каб сьлядоў яго ня стала,
Песьняй трэба так-жа біць.
    Біць ушчэнт чужынца-пана,
    Біць прыслужнікаў благіх.
    А іх логава пагана
    Запаліць з бакоў усіх.

То-ж пладзіліся вякамі
Кроў блакітна, бела косьць,
Лезьлі з Польшчы павукамі—
Ня міне іх наша злосьць.
    Будзем біцца мы з панамі,
    Каб адбіць ахвоту ім
    Грунт араці мужыкамі,
    Край наш польшчыць, звацы сваім.

Хай ня хопіць нам аружжа,
Хай ня хопіць ў песьні слоў—
Ненавісьці маем дужа,
Хопіць сіл—паб'ем паноў.

## НАША РАДАСЬЦЬ

Сярод тэй злыбяды
Акупанскай жуды
Радасьць ёсьць і для нашага брата.
Калі ноччу пад-час
Рухам пэўным раз-раз
Раскапаеш падлогу лапатай.
Паглядзеўшы ў бок
Беражліва пачок
Вынімаеш як нейкую сьвятасьць
І любоўна рукой
Пачок гладзеш ты той,
А на твары рашучасьць, заўзятасьць.
Пасьля месяца сьвет
Памагае як сьлед
Часьць да часьці сабраць аднастволку,
Прыдаць блеск, абнавіць,
Прыласкаць, палюбіць—
Эх, змагарскіх лятункаў тут колькі!
Але трэба ізноў
Далей вока паноў
Захаваць сваю радасьць і сілу,
Хай ляжыць, ня тужыць
Будзе партыі кліч,
Паваюем тады люба-міла.

## ХТО З НАС БУДЗЕ АД БЯДЫ.

Хто з нас будзе ад бяды
Клікаць бога і стагнаць,
Той не барацьбіт тады,
З ганьбай трэба гэткіх гнаць.
Бо работы маем шмат.
Маем моц працоўных рук.
Нечага пужацца крат.
І ня трэба нам прынук.
Горад, вёску скалыхнуць,
Каб пялі ў адзін тон.
Карак панскі скалатнуць,
Каб аж вылецеў дух вон.
Бахнуць па гнязьдзе шпікоў,
Дзе асаднікі сядзяць.
Ёсьць каму без чужакоў
Поле наша абрабляць.
Не хавайся ксёндз і поп—
Кожны з вас прадажны чмут,
Браў апошні грош і сноп.
Жджэць і вас народны суд.
Прэч абшарнік, фабрыкант.
Годзе нашу кроў вам піць.
Прэч прыблуда-акупант
Край наш вольным хоча быць

Прэч падаткі, ні граша
Не даваць у іх кішэнь.
Нас паўстанчая каса
Выручыць у трудны дзень.
Рыскую мяжу парваць
Каб зьяднацца нам з С. Б.,
Каб саветы прывітаць
Ды наладзіць у сябе.
Земляробы-бунтары
Мы чырвонаю мятлой
Вымеўшы тут лад стары
Навядзем парадак свой.

* * *

Згінуў час,
Калі ад веку мы ўсе спалі.
Ўжо для нас
На векі пропадам прапалі
Мары, жудзь
Няволі, твані Беларусі.
— Вольнай будзь!
І ўжо да вольнай я малюся.
Як ня так?!
Даўно пагас іх панаваньня
Зодыяк.
А чырвань захаду як гляне
Ў шкло вакон
Іх фабрык скутых забастоўкай
Доўгіх дзён,—
Агонь надзеліць блеск—абноўкай
Цьму начэй.
Гудкі нам будуць песьнярамі...
Эх, хутчэй-б
Казаць нам выбухам, баямі!
Ай—ю—га!
Лепш сьцеражыся недавера
І туга,
Бо пад маёй сярмягай шэрай

Сэрца ўраз
З уцехі выбухнуць гатова.
Прыйдзе час!
Як дзелам стане наша слова
Ўжо няма
Ні сьцен кітайскіх, меж крывавых.
І дарма
На мапе нам шукаць дзяржавы
Status quo,—
Ўзарвалі ў шчэнт працоўным рухам.
Іх лагво.
Кастрычнікава завіруха.
Ей хвала,
Мятлу чырвоную-падарак
Нам дала,
Што ўвесь сьвет, кожны закамарак.
Падмяла!

# ВАЙНА ВАЙНЕ.

*(Песьня інваліда).*

Вайна сьмяротным рухам-махам
Куе працоўным кайданы.
Апалены крывавым жахам
Рву путы вашыя паны,
    З вайны жывяцца і сыцеюць
    Паны, ваўкі і груганьнё.
    Ад нас крыжы магіл гусьцеюць,
    Нас душыць голад, насланьнё.

Вайна, што цюрмы для народаў
Будуе нашай цемнатой,
Мне сьцёрла цела і уроду
Сваёй жалезнаю пятой.
    Сабе ня міл, людзям дакука.
    Скрып кастыля, то крык душы.
    Грызе боль, гора, смокча мука...
    Эх, што тут сьлёзна мне тужыць!

Надыйдзе час—ён ня мінучы.
Аб'явім мы вайну вайне.
Тады і мой кастыль скрыпучы
Па карку панскім разане.
    За кроў мільёнаў, за пажары,
    За крыўду чорную калек
    Чырвонай помстай, так ударым,
    Што прахам зойдзе панства, зьдзек.

## ВЫНЯСЛІ РАЗ ПАСТАНОВУ

Вынясьлі раз пастанову
Даць святочную абнову
Для батрачкі-Беларусі.
    Апраналі так і гэтак
    На манер яе суседак—
    То завяліка, то душыць.
Клікнулі краўцоў з усходу—
Навярнула іх з заходу.
Дагадзіць ніхто ня можа.
    Ўрэшце ніваю-тканінай
    Беларусь-красу дзяўчыну
    Селянін сам апрыгожыў.
Зноў рашылі дабрадзеі
Выдаць замуж нашу жнею
За багатага суседа.
    Панічы таўкліся хмарай.
    А працоўніца ім жара:
    — Не пайду за дармаеда.
І купец-брухач з усходу,
Шляхціц-махціц аж з заходу
Хвігу зьелі такжа жвава.
    Бо рабочы быў ёй мілы,
    З ім на век саюз зрабіла
    Дзеля шчасьця, добрай славы.

## РАЗВАГА

Здратвана рунь. Плач галодных дзетак.
Пасека—сады, скрозь пакосы кветак.
Мучальнікоў кроў. Матак роспач, сьлёзы.
Пажарышчы сёл. Бежанцаў абозы.
Брату вораг брат. Радась церні раняць.
Працу ратаёў немачай паганяць.
Грабаром жыцьця воля паднявольна.
Будзе, ёсьць, было: доля беспатольна.

Будзе, ёсьць, было—душам забуцьвелым,
Думам без пладоў, думам перасьпелым.
А у змагароў іншыя законы:
Жыць для барацьбы, ходацца да скону,

# ЛЯВОНІХА

Рунь, пралескі доўга мучыў стары сьнег,
А як сонца напужала, дык пабег
Ў лес схавацца аж да сьвята саракоў.
Посьле Травень маем вымецець у роў.
  Шум і гам пад рукі оха ўзялі,
  З печы весела на прызьбу павялі.
  А на выгане бушуюць бугаі.
  Лесавік русалку сочыць у гаі.
Не сьцярпеў нябесны Юр'я ды ураз
Падцягнуў падол свой ёмка пад паяс,
ІВесялушку Лялю крута падхапіў
па лузе з ёй лявоніхай паплыў.

* * *

Кахаю Беларусь сучасную—ня выснену
Рабочым сэрцам, ратая душой.
Кахаю творчым дзелам, а ня мысьлена.
Кладу падмур мазольнаю рукой.

Кахаю радасным каханьнем будаўнічага,
Што кінуў цераз пропасьць мост-праход.
Кахаю гордасьцяй я погляду мужычага
На свой аруд, дзе зьверхам умалот.

Кахаю моцай, блескам току электрычнага,
Што сонцам-чарам апраменіць край,
Калі і паляшук задзівіць энэргічнасьцяй
І акупантам загрыміць: аддай!

Кахаю палкасьцяй агонь-каня сталёвага,
Што нетрам і аблогам дзень і ноч
Развозіць творчы рух, жыцьцё адумысловае,
Наперад, напралом імчыць наўскоч.

Кахаю дзействам спорным я нутра фабрычнага
Машынаў-дабрадзеек, сакатух.
І ненавіджу больш узрыва вульканічнага
Я Беларусь, як служку панскіх слуг.

## БУРА НОЧЧУ

Грукоча гром, віхор бушуе,
Маланкі твораць дзіва, казку,—
То гэта бура так вячуе,
А ўся прырода банкетуе
Надзеўшы чорны плашч і маску.

Адкіну я закон, запрэты.
З размаху ў вір бурлівы скочу.
Хочу там пець жыццю куплеты.
Бардзей пад'едзь Ільлі карэта...
Эх, як люблю я буру ноччу!

## КАЛІСЬ НА СОНЦА...

Калісь на сонца я глядзеў.
Я сьмелы сонцам быць хацеў.
Каб зьнішчыць путы злых начэй.
І сьлёзы паплылі з вачэй;
І плямы чорныя іржой
Ляглі на неба, на людзей...
І зжахануўся я ў час той.
Жыцьцё, людзей хачу любіць,—
Хай сонца на мяне глядзіць,
Як путы рву я барацьбой!

# ЛЕНІН

Ленін—бацька ўсіх працоўных
Ленін—наш чырвоны спас.
Ленін—правадыр галоўны
Да пабед павёў ён нас.
Ленін сеўбіт знамяніты
Слоў працоўнай беднаты.
Праца ўсходзе пладавіта
Надзвычайнай пекнаты.
Ленін выпалаў зямельку,
Бы той рупны гаспадар
З дрэнства-зельля удаленька,
Жыў які і бог і цар.
Распарушыў скрытых юдаў,
Жывадзёраў, Калчакоў;
Разагнаў сьвятых і цуды,
Аман ім на век вякоў.
Для сялян і для рабочых
Шлях змаганьня даў адзін.
Імя „Ленін“ іх яднача
І працоўных усіх краін.
Ленін дуж, бо разам з намі,
Пабядзім мы разам з ім.
Уладу ў сьвеце возьмем самі,
Хто нічым быў стане ўсім.

## ПРАТАЛІНА

Запрапасьціў ад вясны
Юр'я цюхцялей,
Запрапасьціў ён ключы
Ды ўсе залатыя.
Вёска ў крык: „Ай-яй-ей,
Зьелі адсып семянны,
Пуні то-ж пустыя“.
    І з авечкамі бяда.
Пусьціш к вадапою,
Расплывуцца, бы вада,
У хлеў ні нагою.
    Стаднік Буры трацячок,
Хоць быў рад саломе,
Да Субосі ялаўкі
Загарадку ломе.
Род пчаліны у вульлі
Шумна мітынгуе!
Завірухі загулі
І мароз ваюе.
Селянін гаруе.
Хмар хмарней, чарней ральлі
Па суседзях стогне:
—Ці вясну дажджом калі?
А суседзі—Ох, не!

На гумно ў лес ідзе:
„Лыжак пяць заціркі дзе,
Дзе дабыць малым“.
І крык роспачы гудзе
Громам веснавым.
ад крыўды сьлязіна
Брылянціста і пякуча.
Хоць адна была яна
Ды ня змог мароз траскучы.
А прабіўшы сьнег сьляза
Землю ўскалыхнула,—
Крыўду мілага дзіця
З болем маць пачула.
. . . . . . . . . . . . . . . . . .
Гэй! Гура! Ай-ю-га! Трах! Ох!
Вось і па моцных дзьвярох.
Ледзяныя запоры—грузалкі.
Пырснуў сьветам усход яснапалкі.
З рэволюцыйным парадам
Праз парог вадаспадам
Рух наступае,
Перамагае
Прашкоды к маю
Друзгоча на дрэнь
Халодныя люстры.
А злы, як зьмей,
Бы вар—кіпень,
Як полымя шустры.
—Шатруй,

вей,

пей!

. . . . . . . . . . . .

Кужалем ўслалі дарожку,
Каб не збалоціла ножку
Вольная нам вясна-краля.
Вербамі, песьняй віталі
Вышаў і Юр'я з ключамі.
— Як, без мяне? Самапраўна?!
„Цыц, мы і самі з вусамі.
„Бачыш нашліся як спраўна
„Адмычкі твае залатыя.
„Дай выкуем з іх мы званочкі,
„Цяляткам завесім на шыі.
„А не,—марш адгэтуль у прочкі.
І Юр'я празваны галодным
Бы шоўк той зрабіўся лагодным.
(Знаць нават нябеснай уставай
Прызнана учынкам нягодным
Пярэчыць красе малажавай).
Дык юр заюрыў гэтым Юр'ем
Нябёсам ён кінуў: А чур вам!
І ў шумна—вясёлым патоку
Расстаяў і зьнік з ідавоку.

. . . . . . . . . . . . .

Дык вось чаму сонейка мілае
Разгнязьдзілася шумнай квактухай
У праталіне, дзе кволакрылы
Матылёк жджэ канца завірухаў.
Ах, кругом то ня сьнег, ма' быць грэчка

А праталіна гэта гнязьдзечка,
Дзе жыцьцё, бы сасун той, бы жэўжык,
Распавілася з мулкіх пялюшак,
Амбарасаў ніякіх ня меўшы
Сквапна ручкі к вясьне працягае,
Каб квяцістых дабыць пабрындушак.
А пяшчот, і шчадрот колькі можа,
І мядовай сыты колькі мае
Дасьць прырода, чый воблік прыгожы
Там прыгоршняй красу расьсевае.

## БАТРАЧКА

### I

За што мяне судзіць
Вы будзеце, паны?
Пакіньце вы чудзіць.
Ці можа вы п'яны?
За мной хоць век жыцьця,—
Душа мая крыштальна;
Ад злыбеды біцьця
Яна, як накавальня,
Ня покнула—трывала.
Яе прысуд ваш не застраша.
А думкі—пальцы вашай
Душы пустой—
Напракудзілі нямала,
Балотныя яны.
Ня рушце-ж вы душы маей!
За што, паны,
Мне слугі вашы табалой
Стапталі цела працавітае,
Спаганілі мазоль батрачкі—
Мэдаль адбіты.
Працаю найміткі штодня?
Я не прашу ў вас падачкі
Ні ласкі—

Вы для мяне ні ворагі і не радня,
А цені, маскі
Жудасных і прошлых дзён.
Дык што мне ваш закон!
Ад пабояў я хворая
Ды ўся паранена,
Душа, аднак, бадзёрая,
А вопратка рваніна.

II

Змалку, як рыба аб лёд,
Білася з нэндзай і голадам,
Хоць-бы скарыначку ў рот,
Не акалець-бы ад холаду.
Працу і сілы мае
Краў пан штодня рукой белаю,
Клаў у палацы свае,—
Грабіў ён чэлядзь згалелую.
Пухла з бясхлебіцы я,
Бацька і маці зваліліся...
Доля сіроча мая
Красьці, аднак, не манілася.

III

Чысты паніч цёмнай ночаю
Хітра пакусай завабіў.
Эх, гордасьць, славу дзявочую
Ў рванай батрачкі аграбіў.
Што-ж... а далей рэч вядомая—
Нехаця сына прыдбала.
І непатрэбнай нікому я,
Лішніцай, блудніцай стала.

На бездарожжа на лютае
Выгнаў паніч ў непагоду,
З дзіцяткам родненькім скутую
З помстай да панскага роду.

Слухайце ўважна, судзіцелі:
Час залячыў болькі, раны,—
Дык не згарэў двор крыўдзіцеля,
Чэрап ня быў пашчапаны.

IV

Ой, трудна бяздомнай вялося—
Пад тынам жыла, начавала.
Дзіця мне дадзела, ўпяклося:
„Дай есьці, мамулька“, крычала.
У адказ калыханачку пела
І голад двайны я цярпела.

У каравы лахман свой жабрачы
Сыночка прадзябнута цела
Туліла і хухала з плачам.
З мальбой на прахожых глядзела.
Такія, як я, спачувалі,
Паны—дык здалёк абміналі.

За тое, што хаты ня мела,
Была комам брудных анучак...
За то, што за ўсіх я цярпела,
Што нэндза і блуд мой іх мучыў,—
Абодвух за краты густыя
Укінулі людзі благія

Усё, што маглі, адабралі:
Бацькоў, чэсьць, здароўе і волю.

І быццам яшчэ вытыкалі
— Няўжо ёсьць ахвота жыць болей?
Ня кончыла я самагубствам.
Прашло і здаецца ўсё глупствам.

V

Каб вы бачылі, каб чулі,
Вось дзе быў дзяцюк удалы.
Ні яму на мысьлі гулі,
Ні дуронствы. Строгі, сталы,
Сам чытаць, пісаць асіліў.
Ўсё аддаць гатоў быў маці.
Вельмі-ж дружна мы ўжо жылі.
Добра ўспомніць тут, прызнаці:
Ня любіў паноў да сьмерці —
Перад панам ці начальствам
З галавы каб шапку зьдзерці —
Дык ніколі. Ён з удальствам
Словам, дзелам біў, дзе трэба.
Бараніў лапцюжных, кволых,
Дасьць кусок апошні хлеба.
Ня згінаў у горы голаў.
Але стукнула чорна гадзіна.
Злой душы, бы жыгала, язык—
Болей зьлейшаму пану на сына
Насычэў, быццам ён бальшавік.
І з абоймаў пяшчотных, матчыных
З болем вырвалі ноччу глухой
Груганавымі кіпцямі сына,—
Як успомню, стаіць прада мной.

Ён зьяўляецца мне сьветлай хмаркай.
Я сьпяшу прытуліць той прывід,
Але ж гора: ён чэзьне так шпарка,
І ізноў сумам сьвет апавіт.

Знаць, забілі жыцьцё веснавое.
Што ім мукі батрачкі якой!
Я-ж, сыночку, ня мсьціла за двое,—
Ня ўбівала мазольнай рукой.

VI

На чужым, на панскім полі
Працавала, як мурашка,
Без надзеі, без патолі.
Трэба жыць, хоць трудна, цяжка.

Ад цярпеньня ды ад гора
Лік днём, месяцам згубіла.
А як часам сьцісьне змора,
Дык я сьмертухны прасіла.

І ня думала ніколі
Ў гэтай нэндзы, паняверцы,
Што й мяне чакая воля,
Што к жыцьцю заб'ецца сэрца.

Раз на двор з стральбой напалі
З помстай пану хлопцы з вёскі.
Ну і білі-ж, рабавалі,
Не шкадуючы ні трошкі.

Згінуў пан-бы ў страшных муках
І дабро-б яго спылала,
Каб я ў гэтых стуках-груках
Паліцэйскіх не пазвала.

Посьле бойкі іх скруцілі,
Да крыві вяроўкі ўелісь.
Да бяспамяці набілі,
Самі п'янстваваць заселі.

Варту мне здалі з ахвотай.
Частаваў пан рознай стравай,
На пагібель ўсёй галоты
Выпіць чарку даў ласкава.

А нявольнікі снапамі
Ў яме звалены ляжалі,
Злосна бліскалі вачамі,
З болю вылі і стагналі.

— Маці, разані па путах
(Так адзін з натугай кажа),
Хай заместа нас пан люты
Тут з прыслужнікамі ляжа.

Не ўцячэ ад нас нягодны,
Штых, нагайка не паможа.
Ты і мы—сям'я працоўных,
Наша сіла пераможа.

— Кінь, кажу, чаўпсьці пустое,
То Антыхрыстава штукі.
Ўсё ён выдумаў на тое,
Каб людзям надбавіць мукі.

Як і чым асіліш сынку.
То-ж за імі войска, грошы.
Змнуць, як мялі, бы былінку,
Скрышаць вось, як ліст прасохшы.

Нават вожыка рукамі
Голымі ніяк ня возьмеш.

Век былі паны панамі.
Лобам сьценкі не праломіш!—
... Мне адказ—прысуд збавенны
Далі мучальнікі тыя...
Дрэнь цяпер мой боль страшэнны
Ды намеры вашы злыя.

## VII

Як ударылі словам сталёвым,
Іскры пасыпаліся з цёмнай душы.
Адрадзіла бадзёрасьць абновы
Думкі, лятункі ад будняў, глушы.
І здавалася мне, быццам чую
Голас ня іх, а свой сказ нутраны.
Што сынкоў мілых, родных пільную,
Каб падушылі пасьля іх паны.

Запякло ў сэрцы з жалю балесна,
Раны іх сталі мне ранамі быць.
Штось зьвязала нас моцна, сумесна—
Разам памерці, ці разам нам жыць.

Бо як-жа, кажуць, волат Ленін
Збудаваў дзяржаву для рабочых,
У якой трымаюць упраўленьне
І батрачкі—ўмела ды ахвоча.
Раз сталася ўжо слова дзелам,
Раз змаглі там—лопнуць тут таксама.
Аб гэтым нават сьніць ня сьмела,
Што вяльможных расьцярушаць „хамы“,

А ўсё ты, цемната, забітасьць!
Бы за плот сьляпая—я трымала

Падол паноў—ім працавітасьць
І пакору за дваіх давала.

Дзяржавіць я хачу і мушу—
Апраўдацца трэба прад народам,
Ачысьціць вольнай працай душу,
Мужычы грунт ад недародаў.

Пявучай працай прамяніся,
Жыцьцё заняпаўшых кутоў.
Дзень кожны зьвіні адзавіся
Здароўем работы і слоў.

## VIII

Прышла да пана ды кажу
(А банкет быў у разгары):
— „Эх, дрэнна пану я служу,
„Бо замест навукі, кары—
„Здароўе сілы аддаю
„На распусту роскаш пану
„А на пагібельнасьць маю.
„Дай нізрынем лад паганы.
„Шпурнём час нэндзы, крыўды, сьлёз,
„Шкодны ён для нас, для сьвету—
„Крывёю жыў ды з помсты ўзрос.
„Дык ня час тут на банкеты,
„Дзялі зямлю, саху бяры,
„Слухай грамады загаду,
„Старыя межы ты ўзгары,—
„Будзеш дзякаваць за раду.
„Калі-ж сам чалавекам быць,
„Працай жыць з людзьмі ня хочаш,
„За панствам станеш зноў тужыць,

„А папоўскія мецъ вочы
„Жраць воўчым горлам, як калісь,
„То ў нагах шукай збаўленьня
„Пакуль у скуру не далі
„Тыя, з кімі я і Ленін!
„Я путы панскія цяпер
„Скінула з паўстанцаў жвава.
„Час, каб рэволюцыянэр
„Ладзіў лад, заводзіў права.—
Ох, біў-жа мяне ашалелы!
Кроў брызгала кату на твар.
Шыпеў ад нянавісьці белы
— Бяры вось падзяку і дар.
Забіць лёгка мог гад праклятьі,
Аднак, ні тады, ні цяпер
Ні ён, ані допыты катаў
Ня вырвуць мой цьвёрды намер.
Ня вырвуць да волі імкненьне
І веры у моц нашых рук,
Якімі мы зьнішчым з карэньнем
Лад вызыску, зьдзеку, прынук.
Паўстанцы з ратункам пасьпелі--
(Будзь гэта навукай для вас!)—
Каб людзі атруты ня мелі,
Забілі нягодніка ўраз.

## IX

Расказала я ўсё ад пачатку,
А канчаткам хай будзе ваш суд.
Можа кінець у „татаву хатку“,
Можа вынясе сьмерці прысуд.

Доўгі час па дрыгве я брадзіла.
Быў няпэўны і зыбкі мой шаг.
І дарма надрывала я жылы.
Выхад гору шукала ў сьлязах,

Толькі ён, Ленін, бацька працоўных
На грунт цьвёрды паставіў мяне,
Каб узьняцца магла веры поўна
К недаступнай для вас вышыне.

Знала мукі, пакуту, цярпеньне,
Зло змагала дабром у жыцьці.
Вам прасіць у мяне выбаўленьня,
Ня судзіць па бязглуздай стацьці.

Каб для вашай душы вушы сталі
Бы раскрытыя дзьверы, праход,
Чуйце голас мінулае далі,
Скуль гразяць вам мае сьлёзы, пот.

Каб раскрыліся цёмныя вочы,
Для душы, каб ім вокнамі быць,
Дык глядзеце на шлях мой рабочы,
На агонь, што у сэрцы гарыць.

Што-ж судзеце, аднак, адзначаю,
Не герой і ня шышка я ёсьць.
Грамады часьць—сябе называю,
На зямлі я ня вечна, а госьць.

Толькі ўчынкі мае векавечны,
Бо ўзрасьлі з працы цела, душы—
Не нябесныя, а чалавечны.
Імі дуж пераможац-мужык.

Пасьля Леніна хто ня прызнае,
Што для шчасьця наш лад—родны брат.

Што рабочая моц паканае,
Хоць ня мае аружжа, гармат.

Хто пярэча—той хоча, знаць, сонка
Альбо час затрымаць у бягу.
Ці машыне, што прэцца так гонка,
Падстаўляць з злоснай мэтай нагу.
Бажавольнік такі сьмехатворны,
Ён ні вораг, ні грозны сілач,
Ён ні шэльма, ні белы, ні чорны,
А дурны, як з асіны таўкач.

X

У Заходняй Беларусі гэткі суд,
Панскі суд канчаецца расстрэлам
Тым, хто хоча скінуць мулкі іх хамут
Бо апека іх астачарцела.

Драгка загрудкі валтузіць беларус
Акупанта, што налёг з-за Буга.
Не адзін склаў косьці барацьбіт-гарун;—
Прагавіт на трупы пан-падлюга.

Ня зьлічыць тут за Савбеларусь ахвяр
Па астрогах, перасыльных, пушчах.
Марш хаўтурны і сяброў прамовы жар
К ім няведамым ніяк ня луча.

На прадсьмертны іх бунтарскі заклік, бой
„Ура“ ня крыкне ані Кім ні Акцябрына.
І ня прыдуць саветчане табалой
На магілу сумнай гадавінай.

Што ж памерці добра, нават трэба
За то, што шляхам вечнасьці ідзе.

Бо сапраўды-ж мала толькі хлеба
На творчы рух працоўнай грамадзе.
Лёгка паміраць з чырвоным сьцьгам—
За ім мільёны ён пабеды знак.
Побач ворага пракляцьця, зьвягі,—
Легэнды, песьні ткуць для тых ваяк.

XI

Штогод, як стукне студзень,
Ў дзень гадавін сьмерці Леніна,
Калі на зямелькіны грудзі
Сьнег па калені
Ляжа падушкай пуховай,—
Тады на магіле батрачкі,
Нашай змагаркі вясковай,
Можна убачыць ня зьвяўшай
Радосту [1]) чырвоную,
Бы з неба упаўшай,—
Бо ня знаць, каб к магіле
Заслужонай
Сьляды падхадзілі.
А шпегі і ўсе служкі паноў
Праз пыткі і кроў
Хочуць дайсьці, хто радосту
Прыносе.
Баяцца ўзросту
Бальшавізму, бо пакосе
Іх чорныя рады.
Аднак, ніяк не давялося
Зымаць віноўніка бяды.

[1] Радоста — садовая роза.

İ так за гадамі гады
Зыходзяць у вечнасьць чаргой,—
Магілу сьняжком пабялёную
Харошыць радостай чырвонаю
Сам Ленін студнёвай парой.

---

Так заместа вянка для замучанай
Злажыў легэнду ўдзячны люд,—
Барацьбой ён з батрачкаю злучаны
Насупраць панска-польскіх пут.

## ТОКАР ВАСІЛЬ.

Машына радзіла рабочых.
Рабочы-ж машыну, як матку,
Шануе, любоўна, ахвоча,
Глядзіць, каб была ў парадку.

Машына рабочых радзіла,
Яны, з імі разам сяляне
Савецкі Саюз, люба-міла,
Стварылі няшчадным змаганьнем.

Савецкі Саюз тэй машынай
Руіны, аблог крые руняй.
Рабоча-сялянскай лавінай
Машыніць свой шлях да камуны.

Жыцьцё для рабочых сэнс мае,
Жыцьцё тады толькі магчыма,
Калі ўсьцяж гудкамі сьпявае
І сьвеце электро-вачыма.

А рост шпуляк, кранаў-грузілаў,
Магутных дынам і трансьмісій,
Узрост пралетарскае сілы—
Вось нашае дзела і місія.

Калі-ж узрасьце моц працоўных
І пойдзе дарогай змаганьня,
І будзе да бою гатоўнай,
Тады перамога настане.

Беда для фабрычнага люду,
Калі хто з яго ацямнелы
За подкупы ці з перапуду
Ды здрадзіць рабочаму дзелу.

Раз токар Васіль, што век вечны
На фабрыцы рукі мазоліў,
Хоць чуў у нутры голас спрэчны,
Рабочую праўду зьняволіў.

Рашыў ён, што лепш, калі кіне
На ўслугі працоўную сілу
Не пролетарыяту, машыне,
Каб іх барацьба пабядзіла.

Рашыў фабрыканту прадацца,
Служыць інтарэсам багатых.
Сваю і варштата моц-працу
На іхнюю роскаш усватаў.

Ня слухаў народ, прасьцярогаў
Байцоў за яго-ж вызваленьне.
Казаў, што нічога тут злога
Грош лішні прыдбаць у кішэню.

За токара чорны ўчынак
Страшэнны прысуд учыніла
Над сынам прадажным машына—
Па локаць руку адкруціла.

Заенчыў Васіль не ад мукі,
А з долі якая чакае:
Нічога ня варта ён бязрукі,
Сямейка-ж і так галадае.

Хіба фабрыкант на пачатак
Паможа ў бядзе мала-веле.
Бо брат наш тут толькі прыдатак
К рабочым рукам-карміцелькам.

І токар Васіль меў па горла
Тых ласк, дабрадзейств фабрыканта:
Наеўся сьлёз, крыўды і гора
І выляцеў з фабрыкі кантам.

Так, пан для працоўных навекі
Ёсьць клясавы вораг заўзяты.
Мы маем ад панскай апекі
Зьдзек, вызыск, нагайку і краты.

Васіль беспрацоўны, бязрукі
Быў голадам выкінут борзда
З сям'ёю на вуліцы брукі,
Цяпер пераносіць лёс жорсткі.

Васіль стаў шукаць шлях-пуціну
Да волі, машыны і хлеба
Ня ў тым, каб згінаць ніжай сьпіну
І ждаць зьмілаваньня ад неба.

Ён рынуўся ўвесь у змаганьне
Прыгнечаных масаў мільённых,
Хоць можа і сьмерць там дастане
Ды згіне рабочым чырвоным.

Ну што-ж хай жыцьцё пажыраюць
Кайданы ім дасьць у прыдачу.
Да часу яны вычвараюць,
А хутка лад іхні скумячуць.

Васіль нясе ў час дэманстрацый
Скрываўлены сьцяг вызваленьня,
І сам ён ёсьць заклікам працы
На бой з капітала гныбленьнем.



BIBLIOTEKA NARODOWA
Spuścizna po Prof. Wasiłewie 30.XI.63 r.

Spuścizna po Prof. U Taszyniu

30 XI 63

Odkwaszone
12 -02- 2008

BN
BIBLIOTEKA NARODOWA
255876
Cim